На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 112 (694)
Серада, 23 чэрвеня 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Народная Воля

Кошт: у кіёсках і крамах — 20000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Няўтульна на Беларусі творчым людзям!

Пратэст!

Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Уладзімір Някляеў, які знаходзіцца ў Варшаве, заявіў, што не збіраецца вяртацца ў Беларусь


Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Уладзімір Някляеў.

які знаходзіцца зараз у Варшаве, сапраўды прыняў рашэнне не вяртацца ў Беларусь. Пра гэта ён паведаміў у нядзелю, 20 чэрвеня, групе журналістаў у сталіцы Польшчы.

Уладзімір Някляеў выехаў у Варшаву для ўдзелу ў міжнародным семінары літаратараў. Паводле яго слоў, на мінулым тыдні адзін з яго сяброў сказаў, што супраць яго рыхтуецца буйная правакацыя. Гэты чалавек, у прыватнасці, удакладніў, што "Някляева могуць падаць як горкага п'яніцу, які не ведае, што робіць" альбо выкарыстаць у адносінах да яго варыянт, падобны з Міхаілам Чыгіром, нанесціўшы фінансавыя абвінавачанні.

Апошняе зрабіць было давволі лёгка, паколькі Уладзімір Някляеў працаваў галоўным рэдактарам часопіса "Крыніца" і ўзначальваў Саюз беларускіх пісьменнікаў. Аднак нават не гэта стала галоўным матывам рашэння аб яго невяртанні на радзіму. У гутарцы з журналістамі 20 чэрвеня Уладзімір Някляеў сказаў, што, нарэшце, пасля пяці гадоў ілюзій ён зразумеў: дыялог з прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам немагчымы. Паводле яго сцвярджэння, прэзідэнцкае атачэнне складаюць людзі, якіх не хвалюе лёс беларускай мовы, культуры і літаратуры.

Прадугледжваецца, што на гэтым тыдні ў Варшаве кіраўнік Саюза беларускіх пісьменнікаў правядзе вялікую прэс-канферэнцыю, на якой адкажа на ўсе пытанні журналістаў.

Уладзімір ГЛОД.

Сёння ў сталічным Доме літаратара адбудзецца вечарына, прысвечаная 75-м угодкам з дня нараджэння сусветна вядомага беларускага пісьменніка Васіля Быкава

Сёння, а 18-й гадзіне, у сталічным Доме літаратара адбудзецца вечарына, прысвечаная 75-м угодкам з дня нараджэння Васіля Быкава. Дзень нараджэння вядомага беларускага пісьменніка — 19 чэрвеня.

Як паведаміў БелаПАН літкансультант Саюза беларускіх пісьменнікаў (СБП) Аляксей Гардзіцкі, у вечарыне, якую правядзе намеснік старшыні Саюза Вольга Іпатава, чакаюцца выступленні Генадзя Бураўкіна, Анатоля Вярцінскага, Сяргея Законнікава і Міхася Тычыны. Пісьменнік і дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Георгій Марчук прадставіць прысутным новы зборнік аповесцяў юбіляра "Знак бяды". У гэтую кнігу, якая выходзіць у серыі "Беларуская проза і паэзія XX стагоддзя" накладам у 3.250 асобнікаў, уключаны аповесці В.Быкава "Сотнікаў", "Пакахай мяне, салдацік" і "Знак бяды". У вечарыне таксама возьмуць удзел вядучыя беларускія акцёры, якія выконвалі ролі ў п'есах альбо фільмах, пастаўленых паводле твораў пісьменніка.

БелаПАН стала вядома, што, верагодна, бліжэйшымі днямі Васіль Быкаў, які цяпер жыве і працуе ў Фінляндыі па запрашэнні мясцовага ПЭН-цэнтра, прыедзе ў Мінск.

Марат ГАРАВЫ.



Открытое письмо председателю Бобруйского горисполкома Романовскому

В Еловики насильственно предпринимателей не загонишь

По решению Бобруйского горисполкома была запрещена торговля промтоварами на территории колхозного рынка. Уже в 1997 году на рынок в Еловики были переведены, можно сказать, насильно 700 предпринимателей с промтоварами. В результате 30 процентов из них сдали документы в налоговую инспекцию, остальные поехали в другие города: Светлогорск, Жлобин, Солигорск. На сегодняшний день в Еловиках осталось 30 предпринимателей. Сейчас опять по решению горисполкома и лично по настоянию его председателя Романовского еще 900 предпринимателей подлежат переводу в Еловики. Мы считаем, что это — насилие и грубейшее нарушение Конституции Республики Беларусь. Каждый предприниматель имеет право торговать на всех организованных рынках Беларуси, а этим незаконным силовым переводом умышленно разрушается предпринимательская деятельность в городе Бобруйске.

Выход из сложившейся ситуации есть. Мы считаем, что на улице Чонгарской можно разместить около 600 палаток, на улице Социалистической (на пустыре) — процентов 35 всех палаток. И никаких затрат, а только прибыль в бюджет города. Но, увы, в горисполкоме с нашим мнением не считаются. Рынок в Еловиках неприспособлен, и кому могла прийти в голову мысль отделить продовольственные товары от промышленных? Например, приехала на рынок семья: купили продукты, тут же закупили промтовары и, довольные, поехали домой. Возьмем жителей района. Старушка продала молоко, сметану, тут же купила себе блузу, тапочки и т.д. Колхозник продал мясо, купил дочери сапоги, сыну — рубашку, сел в автобус или на поезд и уехал. А можно ли заставить эту старушку или этого колхозника ехать в Еловики? Нет.

Так для кого старается наша исполнительная власть? Мы считаем, что в городе должен быть единый колхозный рынок, где продовольственные товары будут продаваться рядом с промышленными. Если расширить зону торговли вокруг колхозного рынка, выиграют все — как предприниматели, так и бюджет города. К нам поедут торговать со всех городов. А что касается рынка в Еловиках, то там мог бы получиться прекрасный авторынок.

КОНЮШЕНКО И.С., ГОВОРОВСКИЙ А.О, КОВАЛЕНКО С.С., ВИСИКАНЦЕВА И.В. и другие (всего 83 подписи).

Хачу расказаць...

Як мой знаёмы быў парабкам у Польшчы і Расіі

Зусім нядаўна сустрэў знаёмага, які не толькі пабываў, але і працаваў некалькі месяцаў у Польшчы і Расіі. Ягоны расказ яшчэ раз пацвердзіў мае назіранні: якія розныя ў нас суседзі па ўкладзе жыцця і шляхах аднаўлення эканомікі.

Мікалай Аляксандравіч з Кобрына, што на Брэстчыне (яго прозвішча я не называю па вядомых прычынах), па прафесіі ўрач, мае вышэйшую адукацыю і дваццацігадовы стаж работы ў раённай бальніцы. І яго, як і ўсіх нас, непакоіла і непакоіць спрадвечная праблема чалавецтва: як пракарміць і забяспечыць сям'ю неабходным. Дзеці падраслі і іх трэба не толькі карміць і апранаць, але яшчэ і даць ім адпаведную адукацыю. Доўга непакоілі яго балючыя думкі: дзе раздабыць грошы. Была і спакуса выкарыстаць службовае становішча, але...

Праца ў пана Збышэка

Нарэшце Мікалай Аляксандравіч узяў чарговы водпуск і паехаў у Польшчу на ўборку яблык. Зарплату абяцалі па замежных памерах невялікую: ад васьмі з паловай долараў у дзень. Дарога, харчаванне, жытло — і чыстымі на рукі за месяц больш за двесце долараў набягала. Гэта ж не тыя "зайчыкі", што тады атрымліваў Мікалай Аляксандравіч, працуючы ў раённай бальніцы. Праўда, не так лёгка было пераадолець псіхалагічны бар'ер: часова пакінуць сваю любімую працу і падацца на чужыну батрачыць на фермера. Апасля ўжо, вярнуўшыся дадому, выраш ыў, што паступіў правільна: не толькі падтрымаў сямейны бюджэт, але і на свае вочы пабачыў і паверыў душой, што жыць можна значна лепш і ў нашай краіне, калі да ўлады прыйдуць разумныя людзі.

Садовыя ўчасткі пану Збышэку, у якога працаваў Мікалай Аляксандравіч, дасталіся ў спадчыну. Брат Тадэвуша таксама атрымаў свой надзел. Была зямля і ў сястры. Паміж родзічамі пануе ўзгодненасць і ўзаемадапамога. Усё ў іх ад дробязей прадумана: якую мець тэхніку, якіх памераў заказваць скрынкі пад яблыкі і грушы, вішні і слівы, якія хімікаты, інвентар набыць, калі і як рабіць апрацоўку садоў.

У Збышэка вялізны склад і халадзільнае памяшканне. У гаспадарцы два трактары, грузавы і легкавы аўтамабілі, электракары. Гатункі яблык і груш толькі такія, якія можна доўга захоўваць. Сваю прадукцыю Збышэк пастаўляе ў Нарвегію, Швейцарыю, Францыю і іншыя краіны Еўропы. У папярэдні год атрымаў звыш 30 тысяч долараў прыбытку. Падаткі хоць і вялікія, але застаюцца грошы і на развіццё гаспадаркі.

Збышэк трымае толькі аднаго пастаяннага работніка. Сам робіць на трактарах, аўтамабілях, электракарах. На час уборкі ўраджаю наймае пяць-шэсць рабочых. У братоў і сястры працуюць палякі, беларусы, украінцы. Для іх абсталяваны інтэрнат з газавай плітой, халадзільнікам, душам. У халодны і сыры час памяшканне ацяпляецца і прасушваецца. Па заяўках рабочых з магазіна прывозяцца прадукты, іншая дробязь. Разлік робіцца адразу пасля заканчэння сезонных работ. Пры неабходнасці выплачваецца аванс.

Што асабліва ўразіла Мікалая Аляксандравіча — гэта высокая арганізацыя працы, добра прадуманы тэхналагічны працэс. За ўвесь час работы ў Збышэка іх брыгада ніводнай хвіліны не прастойвала з-за адсутнасці тары, неарганізаванасці ці непрадуманасці або нейкіх іншых упушчэнняў гаспадара. Тут сапраўды чалавек працуе не толькі рукамі, але і галавой.

Праца ў пана Патуціна

Зусім процілеглае ўражанне ў Мікалая Аляксандравіча выклікала паездка на другі год на будоўлю ў Маскву. Першае, што там кідаецца ў вочы, — гэта ашуканства. Прадпрыемствы і арганізацыі прыватнага і дзяржаўнага бізнесу, якія запрашаюць у якасці таннай рабочай сілы добраахвотнікаў з былога СССР — беларусаў, украінцаў, таджыкаў, малдаван, абяцаюць заробак 400-800 долараў у месяц, неабходныя бытавыя ўмовы, інтэрнат. На самай справе ўсё інакш. Махлярам галоўнае — уцягнуць чалавека ў сваю фірму, каб ён папрацаваў хоць тыдзень-другі. Уцячэ — не вялікая бяда. На яго месца знойдуцца іншыя. А застанецца, то ствараюцца такія ўмовы, што выбрацца адтуль нялёгка.

У майго знаёмага, калі трапіў на працу ў адну з такіх "фірм", аж вочы, як кажуць, ледзь не павылазілі на лоб ад здзіўлення і роспачы. Кіраваў той "арцеллю" нейкі прадпрымальнік па прозвішчы Патуцін. Новую партыю "шабашнікаў" размясцілі за калючым дротам і жалезнай агароджай. Пад інтэрнат было "прыстасавана" памяшканне былой канторы нейкага прамысловага прадпрыемства, якое пасля банкрутства было выкуплена прадпрымальнікамі і пераабсталявана пад склад. На тры паверхі, дзе пражывала каля ста чалавек, — адзін туалет і адзін рукамыйнік. Двух'ярусныя нары з дошак. Адным словам, было нешта такое, што нагадвала нямецкі канцлагер ці савецкі лагер зняволеных (ГУЛАГ). Галоўнае, што так адрознівала польскага фермера ад маскоўскіх акцыянераў, — гэта арганізацыя працы. Мікалай Аляксандравіч успамінае, як паўтары дні хадзіў за прарабам, каб той выдзяліў аўтакран для падняцця наверх дахавага крыцця. На працягу некалькіх дзён іх брыгада чакала, калі прывязуць звадкаваны газ. Амаль два тыдні сядзелі без працы, бо не паклапаціліся начальнікі пра тое, каб завезці матэрыял для даху, бо заказаць яго загадзя ніхто не патурбаваўся. Рабочыя днямі снаўдаліся па тэрыторыі прадпрыемства, не ведаючы, чым сябе заняць. Некаторыя з іх рабілі рамонт прыватных аўтамабіляў кіраўнікоў фірмы, працавалі на іх асабістых дачах, катэджах. І ўсё гэта, зразумела, за кошт вытворчасці. Ну, чыста савецкі варыянт арганізацыі працы і выкарыстання рабочай сілы. Таму заробак, вядома, быў далёка не той, што абяцалі. Толькі шчаслівчыкі маглі атрымаць за месяц суму, адэкватную двумстам і болей долараў. Некаторыя "шабашнікі" праядалі і прапівалі гэтыя грошы раней, чым паспявалі іх зарабіць. Ад нудоты і незадаволенасці сваім становішчам папойкі там сталіся звычайнай справай. Нішто так не разбэшчвае людзей, як неарганізаванасць працы; нішто так не спакушае чалавека на выпіўку, як няўпэўненасць у сабе, адсутнасць магчымасцяў у дасягненні той мэты, якую паставіў перад сабой.

У Польшчы нават нашы "парабкі" п'юць значна радзей і толькі пасля рабочага дня. Палякаў наогул рэдка сустрэнеш падвыпіўшых у рабочыя дні. Толькі ў нядзелю, пасля наведвання касцёлу, іншы можа прыгубіць чарку-другую "чыста выбаровай".

Паездка на заробкі ў Маскву для майго знаёмага скончылася вельмі сумна. Пасля жнівеньскага абвалу расійскага рубля ўсе фінансавыя аперацыі ў маскоўскіх банках прыпыніліся, работы на будоўлі таксама. Тым, хто раней любіў заглянуць у бутэльку і паспеў патраціць усе свае зберажэнні, прыйшлося вельмі туга. Цэны на прадукты рэзка падскочылі, а рабочым не далі ні авансу, ні канчатковага разліку. У цэхах былога прамысловага прадпрыемства пачаліся сапраўдныя грабяжы: выламвалі і вырывалі з арматурай усё тое, што было зроблена з медзі або алюмінію: рэзалі на кавалкі, упакоўвалі ў сумкі і перакідвалі праз агароджу, а днём здавалі нарыхтоўшчыкам каляровых металаў. Для некаторых гэта быў адзіны сродак, каб за выручаныя такім шляхам грошы набыць білет на праезд дадому.

Мікалай Аляксандравіч, прадаўшы тое-сёе з уласных рэчаў, назбіраў адпаведную суму грошай і двое сутак на перакладных — з электрычкі на электрычку — дабіраўся да роднай Беларусі.

Шмат перадумалася з тае пары. І галоўнае, што вынес з гэтых паездак на Захад і Усход Мікалай Аляксандравіч, — гэта тое, што нам самім трэба рупіцца пра сваю Бацькаўшчыну, на сваёй радзіме ладзіць такое жыццё, дзе б працавітым людзям жылося шчасліва. А што трубяць сёння пра інтэграцыю, аб'яднанне з Расіяй, — то гэта гульня палітыкаў, якую сур'ёзныя і дасведчаныя людзі ўспрымаюць не больш і не менш, як пустабрахалаўку. Яшчэ больш будзем тапіцца ў нашым агульным балоце, яшчэ больш будзе ашуканства і гультайства, яшчэ шырэй распластаецца па аб'яднанай тэрыторыі п'янства, злачыннасць, разгільдзяйства.

Барыс ВАНЮШЫН, пенсіянер.

г.Кобрын.

Сохранит ли Белорусский народный фронт единство?

Сойм БНФ, состоявшийся на прошлой неделе, так и не пришел к единой оценке общественно-политической ситуации на Беларуси. Соответственно нет и единого подхода к тактике действий организации.

Две полярные точки зрения на участие фронта в прошедших и грядущих политических событиях практически не оставляют шансов на дальнейшее сохранение единства этой организации. Прошедший сойм не смог принять ни одного документа принципиального характера, а это означает, что VII съезд БНФ, который намечен на 31 июля 1999 года, будет бурным. Не исключен и раскол фронта. Что ж, в истории, в том числе и в самой новейшей, явление такого рода стало уже обычным.

Через это прошли социал-демократы, коммунисты, профсоюзы, офицерские, ветеранские, женские организации. Похоже, настала очередь и Белорусского народного фронта.

Данила ХАЛЕЦКИЙ.

Стоп-кадр



Пажылая жанчына, якая не пажадала назваць сябе, сядзіць і чытае кнігу каля акенца з надпісам "Абмен валюты". Па яе словах, яна тут ужо тыдзень і цяпер стала першай у чарзе. Долары патрэбны не ёй, а іншаму чалавеку, які працуе і не мае магчымасці выседжваць днямі ў чэргах...

Фота IREX/ProMedia.

Ка-ра-вул!

У хлебе, выпечаным у пякарні пасёлка Целяханы Івацэвіцкага раёна, знойдзена ртуць

У Івацэвічах зафіксаваны абуральны факт: у хлебе, выпечаным у пякарні пасёлка Целяханы, знойдзены шарыкі ртуці.

Жыхар раёна, які купіў у магазіне хлеб, і падумаць не мог, што той тоіць такую небяспеку. Калі за абедзенным сталом заўважыў у мякішы і скарынцы шарыкі ртуці, тут жа, абураны, пазваніў у рэдакцыю мясцовай газеты "Івацэвіцкі веснік".

Журналісты адрэагавалі апэратыўна і папрасілі прадстаўнікоў санітарна-эпідэміялагічнай службы праверыць гэты факт. Разам з імі паглядзець на "цуд" паехалі таксама прадстаўнікі Івацэвіцкага камбіната кааператыўнай прамысловасці, у склад якога ўваходзіць целяханская пякарня. Сігнал пацвердзіўся: у хлебе сапраўды была ртуць.

У гэты час вядзецца расследаванне — праваахоўныя органы і кіраўніцтва камбіната спрабуюць высветліць, якім чынам ртуць трапіла ў хлеб, і ці была гэтая атрутная буханка адзінай у выпечцы пякарні.

Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.

Надвор'е

23 і 24-га чэрвеня па краіне захаваецца пераменная воблачнасць, месцамі, пераважна ў заходніх раёнах, кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Вецер паўднёва-ўсходні 6—11 м/с, пры навальніцах парывы да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўначы — +13...+18, удзень — +27...+32.

Мелодия скрипки

Испуганный взгляд, приглушенный голос и вопрос на устах: "За что сидит этот военный?" Такой была реакция одной пожилой женщины, подошедшей к пикетчикам с портретом Владимира Кудинова. Ей было очень жаль симпатичного молодого человека в военной форме, изображенного на портрете. Когда узнала, что это депутат Верховного Совета, сравнила нашу жизнь с 37-м годом. Осталось в памяти лицо этой женщины, ее встревоженный взгляд и сочувственные слова.

Наверное, в тот момент она представила образы своего детства, рассказы родителей об искалеченных судьбах людей? Может быть, она вспомнила, как кого-то из родных в тот страшный год уводили из дома неизвестные? Может быть, она представила себя такой же 15-летней, как Зоя, дочь белорусского политзаключенного Кудинова, лишенная отца и его мужской заботы? Может быть, она припомнила ту же жалобную мелодию, сопровождавшую ее одинокое детство, которую играла на своей скрипке Зоя?

Сердце пожилой женщины откликнулось на чужую беду и жалобную мелодию скрипки...

Людмила ГРЯЗНОВА, депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, член оргкомитета Хартии'97.



Сёння — апошні дзень падпіскі на "Народную волю" на III квартал!

Пр. Антаніны, Васіля, Івана, Феафана, Цімафея. К. Ванды, Зянона, Юзафа.

ЧЭРВЕНЬ
23
'99 СЕРАДА

☉ Усход 4.38, Захад 21.46, Даўж. дня 17.08
☽ Перш. квадра 20 чэрвеня, Захад 3.09, Усход 17.04

Ситуация

В Минске проблемы с бензином

В понедельник с утра практически на всех государственных автозаправках столицы не было бензина АИ-92. Только спецмашины могли заправляться им в воскресенье и субботу. Несладко пришлось и обладателям машин, "питающихся" дизтопливом и другим горючим.

— Думаю, что в ближайшие дни ситуация нормализуется, потому как через день-другой ожидаются новые поставки топлива, — сказал по телефону заместитель генерального директора "Минскавтозаправка" Николай Юрок.

В понедельник на исходе был 92-й и 95-й бензин на заправках "Лукойла". Правда, руководство этой компании также считает, что через день-другой бензин АИ-92 смогут купить все желающие. Что касается цен на топливо в ближайшее время, то в "Лукойле" их конкретно никто не обозначил. В понедельник на стендах-ценниках компании в Минске светились следующие цифры: АИ-76 — 45 тысяч, АИ-92 — 70 тысяч, АИ-95 — 95 тысяч, АИ-98 — 150 тысяч, дизтопливо — 45 тысяч.

"Бикаран" в понедельник за наличный расчет и вовсе не продавала бензин. Заправиться на АЗС компании можно было только по кредитным карточкам и только тем их обладателям, которые предварительно произвели оплату за топливо. Руководство компании заверило, что к концу недели бензин на автозаправках появится, и его будут отпускать по старым ценам: АИ-76 по 50 тысяч за литр, АИ-92 по 70 тысяч, АИ-95 по 95 тысяч и дизтопливо по 40 тысяч за литр. Цены на бензин "Бикаран", как правило, повышает в начале каждого месяца на 3—6 процентов, и старается в сегодняшней ситуации оставаться верной себе. Очередное повышение цен на топливо компании следует ожидать в июле.

Только по кредиткам можно было заправиться в понедельник и на АЗС "Нэсте". Здесь по "таблеткам" отпускали и 92-й бензин, и 95-й, и дизтопливо. Спокойно дышалось только обладателям машин, работающих на 76-м и 98-м бензине. В понедельник это топливо на "Нэсте" было в продаже и стоило 49 и 150 тысяч за литр соответственно.

Почему же в Минске обострилась проблема с бензином? Отзвуки повышения цен на топливо в России докатились и до Беларуси? В концерне "Белнефтехим" признали: трудности с обеспечением топливом в стране есть. И скорее всего цены на бензин будут повышаться, потому как повышаются цены на нефть.

Что ж, доездим с божьей помощью до конца недели и посмотрим, сбудутся ли прогнозы белорусских бензиновых боссов.

Мария ЭЙСМОНТ.

Белорусские власти за проступки взрослых назначили виновным... ребенка

Власти наши не перестают удивлять белорусскую и мировую общественность. Казалось бы, хапун граждан, уходящих с первомайского митинга, организованного властями в 1999 году, можно было и забыть. Тем более, что суд 14 задержанных граждан оправдал.

Но в тот день "охранкой" было схвачено 17 человек. Трое из них оказались моложе 18 лет и рассмотрение их дел отправили в комиссии по делам несовершеннолетних.

Каково же было удивление в редакции, когда пришло сообщение, что комиссия Заводского района г.Минска мать одного из этих детей — 17-летней Татьяны Морозовой — оштрафовала на один миллион рублей.

Вот это да! Более десятка взрослых не виноваты, а находящийся среди них подросток признан виновным! Такое может быть только на Беларуси, которая напоминает глухой хутор посреди Европы.

Валерий ЩУКИН, правозащитник.

Віншуем!

Кацярына Карабанава – пераможца конкурсу "Геалогія Беларусі"

Рэдакцыя "Народнай волі" і "Малады фронт" падвялі вынікі конкурсу "Геалогія Беларусі", абвешчанага газетай 5 мая.

Віктарына, прапанаваная чытачам "Народнай волі", выклікала шырокі розгалас: даводзілася чуць удзячныя водгукі і цікавыя ўдакладненні, і ад прадстаўнікоў галіновага інстытута, і Акадэміі навук, і ад выкладчыкаў аддзялення геалогіі на геаграфічным факультэце БДУ. Але найбольш, і па-добраму здзівілі адказы: чытачы са сталіцы, з Магілёва і Гомеля, Бярозы і Клецка, Пружан і Баранi, уражаныя багаццем беларускіх нетраў, паднялі горы спецыяльнай літаратуры, каб упэўніцца, што газета напісала праўду. Таму многія лісты, якія прыйшлі на адрас рэдакцыі да канца мая, аказаліся аб'ёмам з салідную курсавую ці нават дысертацыю: і студэнты, і пенсіянеры, адчуваецца, з задавальненнем адкрывалі для сябе геалогію па-беларуску.

Першае месца ў конкурсе заняла 19-гадовая студэнтка з Мінска Кацярына Карабанава. Яе стопрацэнтны адказ на пяці аркушах (!) з пералікам выкарыстанай навуковай літаратуры ў 10 радкоў (!!), набраны на камп'ютэры, увогуле цягне на даклад на даследчыцкай канферэнцыі.

"Малады фронт" запрашае Кацярыну зайсці 24 чэрвеня ў 19.30 па адрасе: Мінск, вул.Варвашэні, 8 і атрымаць відэакасету "Пяты элемент" з беларускім перакладам, стос кніжак, а таксама зборнік "Ды-Джэй Адраджэння".

Беларускія аўдыёкасеты і кнігі таксама выйгралі Вячаслаў Філімонаў з Магілёва, Інха Агеева з Пінска, яе зямляк Яўген Галякевіч і гамяльчанка Юлія Карташ. Яны атрымаюць прызы поштай.

P.S. *"Геалогія Беларусі" была толькі першай у серыі віктарын "Народнай волі". Рэдакцыя разам з "Маладым фронтам" рыхтуе для Вас яшчэ некалькі цікавых і пазнавальных конкурсаў. Сачыце за газетай — і заставайцеся з намі!*

Народная Воля
23 ЧЭРВЕНЯ 1999 г.

Стоп-кадр

Танцор.

Духоўны скарб

Дэмакратычная апазіцыя Беларусі за 35 год

Выйшаў у свет даведнік "Дэмакратычная апазіцыя Беларусі: 1956-1991. Персанажы і кантэкст". Са старонак даведніка паўстае гісторыя беларускага грамадства ў ягоных спробах супрацьстаяць татальнасці. Гэта мірная барацьба за правы асобы, за свабоду творчасці, за шанец для сваёй краіны.

Даведнік "Дэмакратычная апазіцыя Беларусі: 1956-1991" працягвае тэму, распачатую даведнікам "Антысавецкія рухі ў Беларусі: 1944-1956". Гэта праца выканана грамадскім Архівам Найноўшае Гісторыі (Мінск) у супрацоўніцтве з Цэнтрам КАRТА (Варшава).

Ганна ЗАЙЦАВА.

Кашчунства

Кроў людская — не вадзіца

Нядаўна ў "Белорусской ниве" з'явіўся артыкул Валянціна Корзуна аб Курапатах. Зноў робіцца спроба перакласці віну за сотні тысяч нявінна забітых на фашыстаў. Фашысты сапраўды загубілі, расстралялі, спалілі многія сотні тысяч жыхароў Беларусі. Месцамі іх пахавання сталі Трасцянец, Масюкоўшчына, Драздзы...

Што ж датычыцца Курапатаў, то гэта справа рук энкавэдыстаў. В.Корзун гэта добра ведае, толькі ён па заданні тых жа спецслужб даказвае адваротнае. Ён нават не называе сведкаў тых дзён — старых жыхароў вёсак Драздова і Цны: Кацярыну Міхайлаўну Багайчук (1919 г.н.), Мікалая Васільевіча Карповіча (1919 г.н.), Марыю Рыгораўну Пацярчук (1911 г.н.), Валянціну Міхайлаўну Шахаванаву (1922 г.н.), Соф'ю Андрэеўну Козіч (1925 г.н.), Веру Фёдараўну Тоўсцік (1933 г.н.), Матруну Мікалаеўну Мантасаву (1914 г.н.) і многіх іншых сведак тых масавых забойстваў. Яны ў той час (1937—1941 гг.) амаль кожны дзень бачылі, як вазілі вязняў у Курапаты, чулі іх енкі, крыкі і страляніну як днём, так і ноччу.

В.Корзун гаворыць, што, быццам, там да вайны быў цір і стралялі чырвонаармейцы па мішэнях. Але як яны маглі страляць па мішэнях ноччу? Адкуль жа былі тады енкі і крыкі? Не раз хлопцы і дзяўчаты пралазілі туды пад агароджай, каб назбіраць ягад. Тады многія бачылі, як прывозілі вязняў, ставілі іх на калені каля ям і стралялі ў патыліцу з наганаў...

В.Корзун жа спрабуе давесці, што сведкі пераблыталі час і не помняць дакладна, ці расстрэлы былі да вайны, ці ў час вайны. Ды і, маўляў, многія са сведак былі паліцаі, памагатыя немцаў... Хаця на самай справе ўсе мужчыны-сведкі служылі ў Чырвонай Арміі: Карповіч, Свянціцкі і іншыя, а жанчыны ні ў якой паліцыі не былі.

У свой час Леаніду Бязрукаму гаварылі, што НКУС зрабіў вялікую памылку: ім трэба было расстраляць усіх жыхароў вёсак Цна і Драздова, тады не было б жывых сведак. А іх — 219 чалавек, уключаючы і тых, хто падвозіў вязняў на расстрэл.

Трэба адзначыць, што нават само месца — лясны масіў у Курапатах — спрабуюць знішчыць. Там пракладзены газапровад. Знішчылі сотні ям-магіл. Зараз і зімой, і летам некалькі гадоў запар розныя "грамадскія камісіі" праводзяць раскопкі, мэта якіх — знішчэнне астанкаў расстраляных, каб ад злачынстваў расстрэльшчыкаў і следу не засталося.

Але кроў людская — не вадзіца. А тут мора крыві! І ад яе ніякай бруднай маной не адмыешся.

В.ДРАЗДОВІЧ.

Мінск.

За апошнія сем гадоў колькасць рэлігійных аб'яднанняў на Гродзеншчыне павялічылася амаль у два з паловай раза

За апошнія сем гадоў колькасць рэлігійных аб'яднанняў на Гродзеншчыне павялічылася амаль у два з паловай раза, а колькасць канфесій узрасла з 7 да 17.

Сярод 435 абшчын пераважную большасць (399) складаюць хрысціянскія, у тым ліку 169 каталіцкіх, 168 праваслаўных і 75 пратэстанцкіх. Патрэбы вернікаў задавальняюць 160 святароў, 127 ксяндзоў і 92 прэсвітэры. У вобласці функцыянуе шэсць манастыроў і дзве духоўныя семінарыі. Для параўнання: за пасляваенныя гады, аж да 1977-га, было знята з рэгістрацыі 265 рэлігійных абшчын і культавых аб'ектаў, сярод якіх 90 касцёлаў і капліц, 169 цэркваў, чатыры малітвеных дамы пратэстантаў, сінагога і лютэранская кірха.

Ася КУНІЦКАЯ.

На Брэстчыне распачаўся эксперымент па вырошчванні тытуню

Каля 200 гектараў земляў адведзена ў трох калгасах Пінскага раёна пад эксперымент па вырошчванні айчыннага тытуню.

Як стала вядома БелаПАН з афіцыйных крыніц, ініцыятарам такога эксперыменту стаў кіраўнік справамі прэзідэнта Беларусі Іван Ціцянкоў, які з'яўляецца таксама куратарам вобласці. Пад праект выдзелена больш за адзін мільярд рублёў — на закупку насення, ядахімікатаў, будаўніцтва навесу для сушкі лісцяў.

Як заявіў І.Ціцянкоў у інтэрв'ю беларускаму тэлебачанню, тытунь — гэта валютная культура, і на набыццё сыравіны для яго вытворчасці выдаткоўваецца вельмі шмат валюты. "Ну, і самае галоўнае, старажылы памятаюць, што тытунь у агародах рос заўсёды. У перспектыве, вядома, прадаваць яго за валюту мы не будзем, таму што такая сыравіна патрэбна нам тут, у сваёй рэспубліцы", — падкрэсліў кіраўнік справамі прэзідэнта.

Ягор ЗВОННІКАЎ.

З-за неінфармаванасці насельніцтва рэалізацыя прэзідэнцкага дэкрэта аб абавязковым страхаванні транспартных сродкаў на Брэстчыне можа не прайсці ў належныя тэрміны

Каля 450 000 адзінак транспарту, што належаць жыхарам Брэсцкай вобласці, падлягае страхаванню ў адпаведнасці з дэкрэтам прэзідэнта N 8 "Аб абавязковым страхаванні грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў". Атрымаць страхоўку ў абавязковым парадку трэба будзе ў перыяд з 1 ліпеня па 1 кастрычніка, у адваротным выпадку за кіраванне незастрахаваным транспартным сродкам давядзецца плаціць немалы штраф.

Ліцэнзіі на права займацца страхаваннем аўтатранспарту атрымалі 9 страхавых кампаній. Дзве з іх у Брэсцкай вобласці сваіх прадстаўніцтваў не маюць, шэсць маюць не больш за тры філіі і толькі Белдзяржстрах мае 18 аддзяленняў у раёнах і абласное аддзяленне.

Нягледзячы на тое, што да 1 ліпеня застаецца паўтара тыдні, актыўнай працы па інфармаванні насельніцтва аб маючым адбыцца страхаванні ў вобласці не вядзецца; людзі не ведаюць, куды звяртацца за страхоўкай. Больш таго, самі работнікі страхавых арганізацый не валодаюць поўнай інфармацыяй аб дэталях маючай адбыцца кампаніі.

Валянціна КАЗЛОВІЧ, БелаПАН.

Конфликт

Фальшивая нота

С кем бы ни заговорил об этой во многом удивительной истории, восприятие почти у всех становилось очень и очень схожим: "Голодать из-за машины? Эка невидаль. Вон их сколько на авторынке. Да и в то время базары были не хуже. Шелестели бы в карманах деньги...".

И я понял, что "судят" моего героя, Евгения Шаевича Окуня, самой требовательной и высокой мерой — сегодняшнего дня. А событие-то — восьмилетней давности. И развитие получило в канун памятного для всех 1991 года.

Почти 15 лет — представляете? — старшина сверхсрочной службы Евгений Окунь состоял в очереди на право купить автомобиль. И всякий раз его обходили другие, у кого связи, должности, престижные офицерские погоны. Добавим: и творческая выдумка. Ведь чтобы приобрести желанную покупку в обход очереди, надо, "соблюдая правила хорошего тона", обосновать причину. И "найти" желательно вескую. Так, у начальника оркестровой службы возникла загадочная "семейная ситуация", до сих пор никому неведомая. Начальник военного оркестра, в свою очередь как большой мастер вешать лапшу на уши подчиненным, оказался не менее "приличным" и изобрел некие "текущие дела, от оперативного разрешения которых, словно манна небесная, посыплются оркестрантам те же машины, квартиры и прочие блага.

Евгений Окунь терпеливо сносил выходки начальников. До поры до времени. Точнее, того часа, когда стало известно, что военному оркестру выделили очередной автомобиль, а тут вдобавок ожидалось повышение цен. Евгений Шаевич, годами копивший деньги на машину, понял: это его последний шанс обзавестись дорогостоящей покупкой. Поскольку и далее продолжать собирать, считай, такую же сумму не оставалось ни сил, ни желания.

Возглавлявший список очередников музыкант в одиночку и пошел в наступление. А ему — от ворот поворот. Осади, мол, назад. Такой умный у нас не только Окунь, а и сам начальник военного оркестра.

Если быть конкретным, то "заслуженным" он тогда еще не был. И заслуживал лишь быть героем критической публикации для более всего подходящего жанра — фельетона.

Готовясь к встрече с А.Федоровым, я приготовил для него сюрприз: передал письмо (точнее, ксерокопию оного, "засекретив" автора), в котором на считанных страницах — вся жизнь заслуженного артиста: и разводы, и "походы", и искусственно устроенные квартирные лишения для бывшей семьи (по сути бывшая жена и ребенок остались без жилья, но не глава семейства). Не стиль ли это жизни бравого майора, а теперь уже и подполковника? Почему эти "заслуги" не замечают в штабе, в управлении кадров?

Когда напомнил А.В. о злополучной машине и человеке, собственно, пострадавшем из-за него, Федорова, разуверившегося в справедливости (даже, увольняя, выслугу лет подсчитали неверно), невозмутимый начоркестра лишь удивился:

— И до сих пор камень за пазухой держит?

Оказывается, он, Федоров, давно и с той, "окуневской", машиной расстался, на иномарке рассекает воздух и позабыть успел, что служил у него когда-то такой музыкант по фамилии Окунь.

Задолго до путча запестрели страницы республиканских газет действительно событийной информацией.

"Вчера объявил бессрочную голодовку военнослужащий оркестра Министерства обороны Республики Беларусь старшина сверхсрочной службы Евгений Окунь, — писала "Знамя юности". — На этот отчаянный шаг музыканта толкнуло ущемление его прав должностными лицами министерства и военной прокуратуры. До этого он в течение семнадцати месяцев отказывался получать денежное довольствие в знак протеста против неправомерных, по его мнению, действий вышеупомянутых организаций".

После нашумевших публикаций, в том числе в газете "Звязда", №62 (21840) от 26 марта 1992 года статьи "Автомобиль не роскошь, а символ... служебного положения...", военная прокуратура Минского гарнизона провела прокурорскую проверку.

И сегодня можно определенно сказать, что **тогдашний заместитель военного прокурора Минского гарнизона подполковник юстиции И.Лапеко поставил на конвейер действительно до конца не проверенный факт,** на который потом будут ссылаться и министр обороны, и вышестоящие прокуроры, искренне заблуждаясь в своей "правоте".

Что же установил проверкой тов. Лапеко?

"В частности, тов.Е.Ш.Окунь, — извещал он редакцию "Звязды", — в 1978 году по линии Министерства обороны приобрел в личное пользование автомашину ВАЗ-2101, а поэтому, по *существующему порядку, не мог быть поставлен на очередь на приобретение еще одной машины. Более того, вопрос о распределении выделенного в 1991 году оркестру автомобиля рассматривался на совете коллективно (протокол №2 от 22.02.91 г.), на котором начальник оркестра А.В.Федоров не заявлял о том, что Е.Ш.Окунь отказался от своего "права" на автомобиль. Сам тов.Е.Ш.Окунь указывает, что при беседе с ним по этому поводу в госпитале он заявил, что согласен с решением коллектива, кому будет выделен автомобиль.*

Коллектив решил в пользу тов.А.В.Федорова.

Нарушений порядка распределения автомобиля в оркестре штаба БВО, установленных действующим положением в Вооруженных Силах, в ходе проверки не выявлено".

(Исходящий №450, 18 апреля 1992 г.).

Славно потрудились военные юристы. То ли сам заместитель военного прокурора гарнизона, то ли следователи военной прокуратуры, готовившие ответ, "не заметили" ущемления прав очередников и не удосужились провести сверку документов в столичной ГАИ. А если бы такова работа была проделана, то без особого труда военные юристы обнаружили бы запись в учетных документах, где сказано, что технический паспорт автомобиля выдан 21 декабря 1977 года на основании... "справки-счета №288857 от 16.12.1977 года Автомаг. САЦ. ВАЗа". Так причем здесь "линия" Министерства обороны, от которого (еще союзного) старшина Окунь машины никогда не получал? В предновогодье "развалюхе", на которую когда-то ссылался уважаемый тов. Лапеко, стукнуло ровно 21. А в прокурорском проверочном документе машина значится на год моложе. Видимо, не в ту графу посмотрели юристы? Но и не в этой промашке дело. На какой "существующий порядок" ссылается военный юрист, когда согласно руководящему документу, действующему в те годы, **вторую машину разрешалось приобретать... "не ранее чем через семь лет".** Так не ущемлены ли права очередника, считавшегося первым по списку и так не получившего свой законный положенный автомобиль?

А теперь скажите, на каком "диком" Западе юристы будут учитывать тринадцатилетнюю клячу (сейчас 21), однажды приобретенную якобы по линии родного министерства, чтобы отказать в новой покупке?

Так что не автор статьи в "Звяздзе", как сообщает тов. Лапеко, использовал непроверенные данные, "подброшенные" ему старшиной сверхсрочной службы Евгением Окунем, а "аргументы" прокурорской проверки заставляют, мягко говоря, усомниться в достоверности обоснований, что "нарушений порядка распределения автомобилей в оркестре не выявлено". Это юристы поверили на слово начальнику оркестра или его приближенным.

Естественно, подобная перетасовка-подтасовка фактов не могла удовлетворить исстрадавшуюся душу терпеливого музыканта. Он ищет правду, стремится добиться справедливости и обращается в инстанции.

Но как проверяют факты? Даже те, кому по долгу службы, казалось, положено являть собой пример дотошности, ограничиваются отписками. Главное — с плеч долой.

Тогдашний военный прокурор минского гарнизона полковник юстиции А.Кеник учтиво информировал заявителя:

"Ваша жалоба, адресованная Генеральному прокурору Республики Беларусь, поступила в военную прокуратуру Минского гарнизона и мною рассмотрена. Оснований для дополнительной проверки по Вашей жалобе не имеется".

(Исходящий №1024, 11 сентября 1992 года).

Получается замкнутый круг.

Но как понял Евгений Шавич, последняя надежда растаяла, как утренний туман. Он убедился, что ни военная прокуратура, ни штаб утруждать себя дотошными проверками не намерены. Тогда и вспомнил Евгений Шаевич, что он не просто гражданин, а еще и избиратель. И есть в их округе народный депутат Михаил Михайлович Тесовец.

И он решил попытать счастья, обратившись за помощью к народному депутату тогдашнего Верховного Совета. Депутатские запросы М.М.Тесовца подействовали. И со всех инстанций, куда ранее обращался заявитель, хлынул бурный поток, к сожалению, новых отписок. От тогдашнего министра обороны ответ не заставил себя долго ждать. 12 февраля за исходящим №1/10п поступило официальное письмо:

"Народному депутату Республики Беларусь Тесовцу М.М.

Уважаемый Михаил Михайлович!

Вопрос, по которому к Вам обратился Ваш избиратель старшина сверхсрочной службы Е.Ш.Окунь, сформировался в 1980 году и с тех пор развивается в различных вариациях.

Неоднократно проводились проверки жалоб гражданина Окуня Е.Ш., которые показали их необоснованность. **К такому выводу пришли работники прокуратуры Минского гарнизона (подполковник юстиции И.Д.Лапеко)** *(выделено мною. — В.С.)*

Считаю, что специально созданный при правительстве республики независимый орган объективно и компетентно ответил на поставленные в письме Вашего избирателя вопросы.

С уважением...".

Не меньше поднаторели в отписках уже в пору в Комитете при Совете Министров Республики Беларусь с очень длинным названием: по социальной защите военнослужащих, лиц рядового и начальствующего состава органов внутренних дел, воинов-интернационалистов, уволенных в запас (отставку), и членов их семей.

Подписавший документ на имя депутата Верховного Совета заместитель председателя комитета С.Гайдукевич в привычном "военном стиле" вторил:

"Уважаемый Михаил Михайлович!

Сообщаю, что 5 февраля 1993 года в Комитет обратился музыкант оркестра Министерства обороны Республики Беларусь старшина сверхсрочной службы Окунь Е.Ш. с просьбой о защите его прав в приобретении в личное пользование автомобиля типа "ВАЗ" по линии Министерства обороны.

Личные беседы сотрудников Комитета с Окунем Е.Ш., руководством оркестра Министерства обороны, встреча и беседы с коллективом оркестра показали, что, по мнению Комитета, выяснение истинного состояния вопроса и разрешение затянувшегося ***конфликта возможно путем рассмотрения дел в военной прокуратуре*** *(выделено мною. — **В.С.**).*

В связи с этим Белорусскому военному прокурору Глюкову А.К. Комитетом было направлено (исх. №134/02-К от 12.02.1993 г.) обращение Окуня Е.Ш. и просьба о его рассмотрении. Об этом был проинформирован и старшина сверхсрочной службы Окунь Е.Ш.

С уважением..." (исходящий №1/931 от 15.11.1993 г.).

Но к тогдашнему белорусскому военному прокурору Глюкову А.К., как и в Прокуратуру Республики Беларусь, еще полгода назад обращался гражданин Окунь Е.Ш. И не очень интересовали тов. Глюкова проблемы гражданина Окуня.

Жаль, конечно, что инстанции, требующие правдивого изложения фактов, особого тщания и добросовестности от других, сами зачастую не отличаются тщательностью и дотошностью при проверке оных, верят нередко на слово и всегда одной стороне — руководящей. Тем, кто при должности и положении. А рядовой жалобщик остается порой один на один (есть замечательная белорусская фраза "сам-насам") со своими мыслями, волнениями, тревогами, заботами, болью души.

Не исключением стала и эта (в первой инстанции) прокурорская проверка. Иначе не обращался бы Евгений Окунь и в Верховный Совет, и в Контрольную палату, и к народному депутату... А изложи он неверно факты или, что называется, подтасуй их — критикуемые прибегли бы к испытанному методу — иску в суд. Но в том-то и дело, что не было у них каких-либо зацепок в отношении военного оркестранта. Зато в достатке, с лихвой довлело чувство корпоративности, как говаривали в доперестроечные годы, — ложного коллективизма. "Ах, он так! Да мы его проучим".

Печально, что и в пресс-центре Министерства обороны Республики Беларусь нашелся человек, нагородивший столько нелепиц в угоду, мягко говоря, ведомственным интересам или из желания окончательно пригвоздить к позорному столбу этого... осмелившегося вынести сор из избы старшину сверхсрочной службы Окуня.

Удивляет не только рождение подобного "опровержения", а и место его публикации. Сказка, статья журналиста Евгения Сульты под заголовком "Голод не тетка" была опубликована 30 января 1993 года в газете "Знамя юности". По логике вещей здесь должно было печататься и сообщение о принятии "действенных мер". Но в том-то и вся суть, что никаких, по сути, шагов во имя торжества справедливости никто из должностных лиц не только не предпринял, даже пальцем не пошевелил, чтобы хоть чем-то помочь служивому человеку. Зато в военном департаменте по связям с общественностью и прессой активно принялись шельмовать не только героя нашумевшей публикации, но и автора предыдущей статьи, и коллегу, военного журналиста. И опубликовали всю эту "чернь" в одной из газет 4 февраля 1993 года.

Я пытался уточнить авторство этого пасквиля (иначе не назовешь) у бывшего начальника Управления информации и связи с общественностью Министерства обороны Республики Беларусь полковника запаса Владимира Чехова, которому, кстати, в свое время подчинялся и пресс-центр, и его первый руководитель Владимир Заметалин. Однако припомнить "авторство" этого "документа" не смогли ни Владимир Иванович, ни офицеры пресс-центра, который за эти годы, считай, полностью обновился.

"Голодовка" Евгения Шаевича, как сказано в статье, объявлена потому, — утверждает далее пресс-центровский "опроверженец", — что ему как очереднику не была выделена для покупки автомашина. Этот факт формально соответствует действительности". Но только ли формально?

*** На 24-м году службы он вдруг перестал соответствовать должности.**

*** 15 лет добросовестно состоял в очереди, чтобы приобрести в личное пользование легковой автомобиль. Не получил из-за... социальной несправедливости. Иначе, пожалуй, не скажешь.**

*** 38 дней голодал на глазах у сослуживцев, добиваясь разрешения конфликта по совести.**

* 24 месяца отказывался получать денежное довольствие в знак протеста против неправомерных, по его мнению, действий должностных лиц Министерства обороны Республики Беларусь и военной прокуратуры.

*** Вот уже почти четыре года после увольнения в запас инвалид Вооруженных Сил Республики Беларусь, как определила МРЭК (медико-реабилитационная комиссия), не получает пенсии из тех же принципиальных соображений...**

Кто же он, Евгений Окунь, — странный человек или борец за справедливость?

Неординарность случившегося еще и в том, что в орбиту событий были втянуты многие высокопоставленные лица, видные политики, народные депутаты, юристы. Имена многих из них на слуху и сегодня. Одни ушли, как говорят, в тень, навсегда покинув арену политической жизни. Другие, наоборот, оказались на ее гребне, перешагнув очередную ступеньку служебной лестницы. Третьи из последних сил тащатся, пыжатся, стремясь "вырубить" свою политическую нишу: создают партии и партийки, всевозможные фонды и общества, по-прежнему желая хоть чем-то, но только и непременно руководить, дождавшись заветного часа (а вдруг пробьет?), чтобы снова оказаться на волне, в водовороте новых событий.

Удивительно в этой истории другое. Все, к кому обращался музыкант военного оркестра Евгений Окунь с просьбой помочь разрешить проблему, справедливо разобраться в ее истоках, лишь демонстрировали свои благие намерения, отдавая дань показной активности — так модному формализму в виде... "деловых" отписок.

Политики, которые со всех трибун твердят о своей неустанной и неусыпной заботе о народном благе, прошли стороной, не заметив конкретного человека, так нуждавшегося в их поддержке, сочувствии, деловом, а не показном участии.

Как же так получилось, что судьба одного и показная бравада политиков, государственных мужей, законников с армейскими погонами и без оных разминулись?

Такова эта история. В документах, фактах, комментариях. И таков небольшой экскурс в недавнее "справедливое" прошлое.

Но прошлое ли?

Виктор СВИРКО,
полковник в отставке.

Не даехалі...

Кіеўскае "Колесо" пакацілася ў іншы бок

Гастролі знакамітага Дзяржаўнага кіеўскага тэатра-кавярні "Колесо", якія павінны былі адбыцца на Беларусі з 25 па 28 чэрвеня, перанесены на кастрычнік.

Гэта не звязана ні з палітыкай, ні з фінансавымі цяжкасцямі. Проста на радзіме кіяўляне затрымаліся з выпускам чарговай прэм'еры, таму прыезд на Беларусь раптоўна прыйшлося перанесці. Але, як запэўніла намеснік дырэктара Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Ірына Шмырова, "Колесо" абавязкова прыедзе на Беларусь у кастрычніку.

Тэатр-кавярня "Колесо" існуе ўжо дванаццаты год на кіеўскім Манмартры — знакамітым Андрэеўскім узвозе, дзе працуюць майстры-рамеснікі, мастакі, дзе месціцца Андрэеўская царква, музей Міхаіла Булгакава і Музей адной вуліцы — Андрэеўскага ўзвозу...

Яны пакажуць толькі тры спектаклі. Спектакль "Шантрапа" акцёра, рэжысёра і драматурга Панаса Саксаганьскага ўжо паспеў наведаць шмат фестываляў ды адхапіць гран-пры "Славянскіх сустрэч" пяць гадоў таму. Гэта п'еса ўзору 1914 года, у якой брала ўдзел Марыя Занькавецкая, зорка ўкраінскай сцэны! Але ж і сучасная пастаноўка Ірыны Кліщчэўскай, мастацкага кіраўніка "Колеса", ацэньвалася прадстаўнікамі розных культур з аднолькавым захапленнем.

Поспех спектакляў "Колеса" быў відавочным і на вялікім кіеўскім фестывалі "Кіеў траўневы", падчас якога на сцэне акцёры "Колеса" яшчэ раз пацвердзілі свае высокія прафесійныя якасці.

Што ж, будзем спадзявацца, што ў кастрычніку "Колесу" нішто не перашкодзіць "дакаціцца" да Беларусі.

Жанна ЛАШКЕВІЧ.

Вернісаж у нямецкай амбасадзе

У амбасадзе Фэдэратыўнай Рэспублікі Германія адбыўся вернісаж мінскай мастачкі Зоі Луцэвіч. "Германская амбасада спрабуе стаць актыўнай сацыяльнай часткай у Мінску, — адзначыў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол ФРГ Хорст Вінкельман. — І мы зможам дасягнуць гэтага не толькі штодзённай працай, але і зваротам да культуры".

За плячыма маладой мастачкі Зоі Луцэвіч не толькі вучоба ў мастацкіх установах Беларусі і Германіі, але і шмат выставаў. У яе творах — яскравае спалучэнне глыбокай філасофіі і дзіцячай шчырасці. І ў кожнага яе работы выклікаюць менавіта свае, патаемныя асацыяцыі і пачуцці. Напрыклад, для спадара Вінкельмана — гэта свайго роду медытацыя. На яго думку, Зоі Луцэвіч удаецца зазірнуць у самую глыбіню і ў той жа час застацца на азначальнай адлегласці ад штодзённасці.

Ганна СОУСЬ.

На думку экспертаў Мінэканомікі, галоўнай праблемай экспарту прадукцыі машынабудавання на ўмовах лізінгу з'яўляецца дэфіцыт свабоднага капіталу

Галоўнай праблемай экспарту беларускай машынабудаўнічай прадукцыі на ўмовах лізінгу з'яўляецца дэфіцыт свабоднага капіталу. Такі вывад утрымліваецца ў аналітычнай даведцы, якая прадстаўлена ў Савета міністраў Беларусі Міністэрствам эканомікі.

У той жа час эксперты міністэрства, у прыватнасці, выступаюць супраць удзелу ў лізінгавых аперацыях бюджэтных і дзяржаўных сродкаў. Як адзначаецца ў аналітычнай даведцы, у прамыслова развітых краінах правядзенне лізінгавых аперацый мяркуе ўдзел толькі прыватнага свабоднага капіталу, паколькі лізінг з'яўляецца адным з выгадных артыкулаў укладання сродкаў. Разам з тым, прызнаюць яны, павелічэнне экспарту ў Беларусі пры адсутнасці свабодных прыватных капіталаў і дэфіцыце абаротных сродкаў саміх прадпрыемстваў магчыма толькі пры дзяржаўным фінансаванні лізінгу.

Міністэрства эканомікі прапаноўвае распрацаваць сумесны расійска-беларускі інвестыцыйны праект, для ўдзелу ў якім плануецца прыцягнуць беларускія і расійскія банкі, страхавыя кампаніі і сродкі саміх прадпрыемстваў. Распрацаваць праект даручана экспертнаму савету, у склад якога ўваходзяць спецыялісты ўрадаў Беларусі і Расіі.

Аляксандр ПАПОВІЧ.

Ваеннай пракуратурай узбуджана крымінальная справа па факце незаконнага прысвоення пярвічных афіцэрскіх званняў службовымі асобамі Брэсцкага аблваенкамата і упраўлення кадраў Мінабароны

Беларускай ваеннай пракуратурай узбуджана крымінальная справа ў дачыненні начальніка 3-га аддзела Брэсцкага абласнога ваенкамата падпалкоўніка Т. і начальніка аднаго з аддзелаў упраўлення кадраў Міністэрства абароны палкоўніка Л. за незаконнае прысваенне пярвічных афіцэрскіх званняў грамадзянам, якія не маюць на гэта права. Ужо устаноўлены 33 падобныя эпізоды.

Як патлумачыў БелаПАН намеснік Беларускага ваеннага пракурора, палкоўнік юстыцыі Аляксандр Піляўскі, первічныя афіцэрскія званні прысвойваліся асобам, якія мелі вышэйшую адукацыю, але не абучаліся на ваенных кафедрах ВНУ і не праходзілі тэрміновую службу. У такой сітуацыі, паводле ягоных слоў, гэтыя грамадзяне пасля заканчэння ВНУ павінны былі ісці служыць у войска, аднак, атрымаўшы званне "лейтэнант запасу", ухіляліся ад прызыву. Пры гэтым у загадах аб прысваенні звання афіцэра запасу, якія накіроўваліся на подпіс міністру абароны генерал-палкоўніку Аляксандру Чумакову, быў запіс аб тэрмінах праходжання той альбо іншай асобай тэрміновай ваеннай службы.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

Сон

Я лежала на кушетке в большой мрачной комнате. Надо мной склонилась женщина в белом халате и зачем-то поливала мою голову холодной водой. Очень холодной, ледяной, водой.

Долго и невнятно она объясняла, что со мной происходит. Из обрывков фраз, которые доходили до моего спутанного сознания, я понимала, что страшно больна. Неизлечимо.

Это была я и не я.

Разве такое могло случиться со мной? Я еще молода, у меня маленькая дочь. Нет, в таком возрасте ***так*** заболеть невозможно. Рак. Опухоль головного мозга.

Мой старший брат глядел на меня и в сторону. Он не пытался меня утешить. Говорил, что диагноз еще окончательно не установлен. Рано ставить на себе крест. Я обязательно поведу осенью свою девочку в школу. В первый класс.

Новые мысли, вопросы, как ток, пронизывали меня.

Где меня похоронят? Рядом с папой осенью прошлого года похоронили двухмесячного племянника. Мама сказала, что после того как покинет эту бренную землю, будет лежать рядом со своими Станиславами. На кладбище тесно, и нет места рядом с папой. Значит, меня похоронят в другом месте. Я буду лежать в тесном гробу, в темной земле. Совсем одна.

Я иду по какому-то неуместно широкому коридору. И думаю о смерти. Пожалуй, это самое скверное, что может делать человек в таком положении. Но невозможно избавиться от этих мыслей. Не получается их заглушить, унять, сбросить.

О смерти я думала и раньше. Но только сейчас понимаю, как это страшно — умереть. В мире есть много грустного, печального: разлуки, болезни, горести, несбыточные мечты, неосуществимые надежды, невыразимые и невыраженные чувства, и есть смерть. И вот она — такая близкая, неизбежная. Пришла, не спросив.

Я не хочу умирать.

Неожиданно я вспоминаю, что не закончила материал, не забрала фотографии к статье. Но, тут же спохватившись, успокаиваюсь: я же еще живу. И вообще, у меня совсем не болит голова. Откуда тогда этот страшный диагноз? Может, врач ошиблась? Я хватаюсь за этот неожиданно брошенный самою же спасательный круг...

Конечно, она ошиблась, она непременно ошиблась. Я помню, писала материал о головных болях. В моем возрасте невозможно заболеть раком. И тут вспоминаю, как знакомый врач рассказывал о двадцативосьмилетней женщине, которая умерла от рака. У нее была двухлетняя дочь...

У меня холодные ноги. Я пытаюсь согреться. Но мне холодно. С огромным трудом, дрожа, я натягиваю на себя одеяло. Приподнимаюсь.

Рядом, посапывая, спит муж. В окне огромная луна. На циферблате часов замерли цифры. 04.21.

Господи, это сон. Это всего лишь сон. Безжалостный, нескончаемый, дикий, жуткий сон.

...Это была я и не я. Разве такое могло случиться со мной?..

Мария ЭЙСМОНТ.

Прычапіліся...

Днямі сябра Маладога фронту Зміцер Каспяровіч разам са сваім знаёмым Алегам Круляўскім раздаваў газету "Рабочий" ля прахадной завода імя Арджанікідзе. Да іх падышлі некалькі чалавек і, не паказваючы дакументаў, назваўшыся аховай завода, запатрабавалі спыніць так званую "бэнээфаўскую агітацыю". Але хлопцы не звярнулі ўвагі на незаконныя патрабаванні "ахоўнікаў". Праз 20 хвілін прыехалі супрацоўнікі міліцыі і даставілі іх у РАУС Савецкага раёна. Не прад'яўляючы абвінавачванняў, праз некалькі хвілін Каспяровіча і Круляўскага адпусцілі.

Таццяна ВУЗІК.

Народныя прыкметы

Буслы прынеслі гарачае лета

Калі з боку Нёмана ўязджаеш у вёску Пясочнае, што на Капыльшчыне, адразу заўважаеш буслінае гняздо. Прыгажуні-птушкі прылятаюць сюды штогод, і мясцовыя жыхары ўжо не могуць уявіць сабе лета без буслінай сям'і.

Сёлета ў буслінай "хатцы" цесна: мамуля і татуля гадуюць траіх птушанят. А мясцовая бабуля Яня кажа, што гэта добры знак. "Калісьці яшчэ мая прабабка казала, што буслы паведамляюць нам, якое будзе лета, — расказвае 80-гадовая жанчына. — Звычайна напярэдадні лета ў буслоў нараджаюцца птушанята. І калі лета будзе цёплае, бацькі пакідаюць іх. Цешацца дзеткамі самі, і дазваляюць захапляцца імі ўсім людзям. Калі ж лета будзе халоднае, бацькі пакідаюць толькі адно бусляня. Птушкі ведаюць, што пракарміць траіх не змогуць".

Гэтым летам трое буслянят не толькі ў пясочненскай буслінай сям'і. Паглядзіце вакол. Напэўна, у вашых мясцінах таксама пасялілася шматдзетная бусліная сям'я...

Алесь САЧЫК.

Стоп-кадр

Спёка.

Фота Яўгена КОКТЫША.

Народная Воля
23 ЧЭРВЕНЯ 1999 г.

Впечатления

Павел САМСОНОВ

VIII. Воспоминания о днях, проведенных в Америке

(Окончание, начало в №№104—111.)

Как сын Билла Гейтса будет поступать в университет

Еще один стереотип: раз обучение платное, значит, деньги на бочку, и ты поступишь, куда хочешь, и диплом тебе обеспечен. Ничего подобного!

Во-первых, любой университет имеет свои требования к поступлению, и они тем выше, чем выше престиж университета. Сын знаменитого Билла Гейтса не поступит в хороший университет с плохими отметками, даже если его папа подарит парочку миллиардов этому университету или построит на его территории олимпийский спортивный комплекс. Вступительных экзаменов в университет нет, но абитуриент должен пройти по конкурсу школьных дипломов плюс балл за специальный общенациональный экзамен. Платность обучения и его конкретная стоимость не имеют отношения к конкурсу и зачислению. Например, стоимость одного года обучения в Гарварде составляет 35 тысяч долларов, но конкурс в среднем сорок человек на место. И это не обязательно дети богатых родителей. И как же сын бедняка сможет учиться в Гарварде, если поступит?



Возможно несколько вариантов. Во-первых, конечно, родители заплатят, если смогут. Большинство старается именно так и делать. Это чрезвычайно накладно. Но если ребенок талантлив, если у него только отличные оценки за последние два школьных года, то университет будет учить его бесплатно. Независимо от доходов родителей. Дочка наших знакомых ученых-химиков из Киева уже обеспечила себе поступление и бесплатное обучение в университете тем, что за 10—12-й классы у нее не было ни одной "В" (четверки). Дети из неполных семей, национальные меньшинства, инвалиды и демобилизованные военнослужащие имеют свои льготы в оплате обучения. В государственных университетах, составляющих основу высшего образования Америки, жители данного штата платят только 30 процентов платы за обучение, что составляет только одну десятую реальной стоимости образования. Кроме этого, существует масса фондов, готовых предоставить финансовую помощь бедным, талантливым и со средними способностями американцам. В каждом университете есть консультационный центр по финансовой помощи. Финансовая помощь оказывается целенаправленно, и она покрывает либо значительную часть, либо полностью расходы на образование. В этих случаях нужно будет доказать, что родители неспособны заплатить за образование, что доходов и накоплений у данного бедного студента не существует.

Конечно, не все так идеально. Если у вас оценки были хорошие, но не выдающиеся, да и по другим категориям не попадаете на финансовую помощь, что делать? Есть несколько путей. Самый легкий, если родители заплатят, ну а уж если не хочется беспокоить, то тут надо самому платить. А это либо работать и учиться, либо брать займ в банке с выплатой в 10—20 лет. Банки обычно охотно дают займы, особенно если студент учится в хорошем университете. Ведь хороший университет практически гарантирует трудоустройство, а это значит, займ будет возвращен с процентами.

Но и это не все. Некоторые идут в армию, чтобы поступить в университет и оплатить себе обучение. Подписывается контракт, по которому военнослужащий по истечении определенного срока службы (например, три года), получает от армии право на поступление в любой университет, да еще и с оплатой учебы и основных жизненных расходов. Иногда бывает и наоборот: человек, закончивший университет и не имеющий возможности вернуть долг банку, идет в армию, где и подписывает контракт о погашении его долга военным ведомством в обмен на несколько лет службы. Конечно, это не имеет отношения к зарплате военнослужащего, которая, в общем, невысока по американским меркам (в районе тысячи долларов в месяц на неженатого рядового).

Отцы и дети

Есть еще один стереотип представления: поступает ребенок в университет, и все: на этом его отношения с родителями заканчиваются.

Нет. Во всех университетах есть специальные родительские дни, когда родители посещают своих детей, есть праздники, когда родители приезжают, например, на футбол, а потом вместе едут в ресторан на семейный обед. Родители помогают снять квартиру, купить мебель, устроиться, да и первая машина почти всегда подарена папой с мамой. Ну а уж после поступления в университет — тут уж, как водится, радостные папа с мамой дарят ребенку новенькую "Хондочку", или "Неончик", или что-нибудь в этом духе. Чтобы не хуже, чем у людей, да и чтобы папу с мамой почаще навещал. Да и нагрянуть без звонка родители тоже могут: проверить, делает ли сыночек уроки или на танцы поехал.

Американские преподаватели: люди ли они?

Занятия в американском университете сильно отличаются он наших представлений. Во-первых, лекций как таковых нет, хотя некоторые преподаватели называют свои занятия лекциями. Никаких "повторяю для тех, кто не записал". Дело в том, что текст лекции можно найти в учебнике или в специальной брошюре, которую преподаватель раздает перед началом курса или на первом занятии. В такой брошюре вы найдете требования к студентам этого курса, расписание занятий, сведения о преподавателе, его (ее) адрес, телефон, время для индивидуальных встреч со студентами, система оценки курса, задания для каждого занятия, подбор статей из журналов и газет и многое другое.

На занятиях обсуждают материал, который должен быть подготовлен к данному занятию. Преподаватель никогда никого не вызывает, все ответы должны быть исключительно добровольными. Даже если ваш ответ неправильный, преподаватель обязательно похвалит вас. Замечания вам будут сделаны либо в письменном виде в записке, либо после занятий строго наедине. Как уже было сказано, оценки строго конфиденциальны, и если вы захотите узнать свою оценку за курс, нужно будет связаться с преподавателем или обратиться в специальный отдел университета, где по предъявлении вашего студенческого удостоверения вам покажут вашу оценку на экране компьютера.

Как правило, оценка за курс складывается из нескольких показателей — посещаемости, небольшого исследования, критики статьи и одного-двух подготовленных выступлений. Чем выше оценки за каждый из этих аспектов, тем выше общая оценка. Экзамены бывают редко. Иногда дается тест, но считается, что и экзамен и тест — лишь проверка памяти в стрессовой ситуации.

Многие преподаватели добиваются от студентов, чтобы те максимально раскрывали свой потенциал. Например, студент сдает курсовую работу. Преподаватель возвращает ее на доработку с замечаниями (начиная с комплиментов, конечно) и указаниями, как улучшить работу. После исправлений и улучшений, студент опять сдает работу, благо, оригинал сохранен на компьютере, а преподаватель либо ставит отличную оценку, либо возвращает ее опять, чтобы студент все-таки довел работу до уровня отличной оценки.

С преподавателем всегда можно договориться о переносе или отсрочке какого-нибудь задания и вообще обо всем. Правда, несмотря на такую либеральность, требования всегда остаются очень высокими и обязательными к выполнению.

Некоторые преподаватели любят проводить занятия либо у себя дома, либо дома у одного из студентов, благо, жилплощадь позволяет. При этом поощряется приносить с собой еду и безалкогольные напитки для общего стола.

Один-два раза в год преподаватели собираются у заведующего. Приглашаются и студенты-магистранты, и докторанты, с супругами или друзьями. Все приносят с собой какие-либо угощения и напитки, хотя иногда ужин дается целиком за счет хозяев. Играют на пианино, на флейте, разыгрывают маленькие рождественские подарки. Атмосфера очень раскованная и непринужденная, слышатся взрывы смеха, необидные шутки и подначки.

В целом отношения преподавателей и студентов очень дружественные, хотя это не влияет на требовательность преподавателей. Связь между преподавателями и студентами не обрывается после окончания вуза. Преподаватели, особенно на магистратских и докторских программах, помогают студентам в трудоустройстве и поддерживают контакт в течение многих лет. Студенты пользуют университет как место для завязывания будущих деловых контактов. Существует неписаное правило: выпускники одного и того же вуза обязаны помогать друг другу. Выпускники, ставшие богатыми и влиятельными людьми, дают много денег университету, иногда многомиллионные суммы, помогают беднейшим студентам, организуют различные фонды. Эта статья доходов университета — отнюдь не последняя.

Вместо заключения

Прочитав написанное, я понял, что не сказал и сотой доли того, что хотел. Как рассказать о четырех годах? После четырех лет многие вещи, казавшиеся удивительными, кажутся теперь банальными. Пивные бутылки, пробки которых открываются рукой. Бесплатная вулканизация пробитого колеса. Радостное приветствие незнакомого человека, который так рад вас видеть, будто он всю жизнь ждал этой встречи. Возможность купить в кредит любую вещь и пользоваться ей, выплачивая несколько долларов в месяц.

Когда я вернулся в Минск, то по привычке стал пропускать в трамвай активно штурмующих людей. Зевал я, перед мной закрылась дверь и трамвай не ушел без меня. Когда я наконец дозвонился в справочную, девушка раздраженно и быстро назвала номер нужного мне телефона и бросила трубку, едва я успел запомнить первые две цифры. Когда я пытался сходить в наш магазин, то мне и в голову не пришло, что было время обеденного перерыва. "Это тебе не Америка", — говорят мне люди. Знаю. Я и не ожидал покупок в кредит. Но так ли сложно организовать прием в поликлинике по телефонному звонку вместо того, чтобы заставлять людей являться туда к восьми за талоном? Так ли трудно предупредить родителей о школьном собрании за две недели, передав маленькую записку через ребенка-школьника? Неужели невозможно организовать торговлю без обеда?

Так ли трудно иметь по мужскому и женскому туалету на каждом этаже, а не через?

И так ли трудно сдавать в эксплуатацию унитазы с крышками и ручками, а не с проволочками вместо последних? И не красть туалетную бумагу и мыло? И так ли сложно догнать Америку в этом?!

Погляд

Радыёэфір: хвіліна – на роднай мове, дзве – на расійскай

"Усыханне" ў радыёэфіры роднай мовы

Шаноўная рэдакцыя!

Кожнага, хто неабыякавы да адраджэння беларускай мовы, не можа не трывожыць паступовае і бесперашкоднае выцясненне яе з дзяржаўнага і грамадскага ўжытку, са школ, вышэйшых навучальных устаноў. І што асабліва непакоіць — у радыёэфіры, дзе асабліва моцна адчуваецца рука дзяржавы, што трымае на кантролі падпарадкаваныя ёй сродкі масавай інфармацыі. Уключыш раніцой дынамік на сцяне — спярша быццам усё, як кажуць, у норме: вядучыя перадач "Радыёфакт", "Сталіца" і іншых размаўляюць увогуле на нядрэннай беларускай мове. Але часцей за ўсё да тых пор, пакуль да мікрафона не падключаюцца іх суразмоўцы. Тут ужо пачынаеш забываць, што ты жывеш у Беларусі, а не дзе-небудзь у расійскай глыбінцы.

Хто б не ўступіў у размову з вядучымі перадачы — чыноўнік з прэзідэнцкага атачэння ці ўрада, дэпутат так званага нацыянальнага сходу ці дырэктар завода, старшыня калгаса ці шараговы інжынер, калгасная даярка — усе так і плішчацца быць "рюскімі". Грашаць гэтым нярэдка і прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, чыноўнікі з Міністэрства адукацыі. Неяк ішла перадача аб школьнай рэформе. І суразмоўца радыёжурналіста з гэтага ведамства адказваў на пытанні толькі па-руску. І такое можна пачуць на працягу ўсяго дня. Ну, а калі ўжо пойдуць "касякамі" рэкламныя аб'явы, тут дыктары дудзяць старанна ў адну "дуду" — расійскамоўную, быццам па-беларуску іх ніхто не зразумее.

Няўжо так нам хочацца дагадзіць — любой цаной! — заезджым з Расіі камерсантам, купцам і прадпрымальнікам? Але ж стала прыжывацца на першым расійскім тэлеканале беларускамоўная рэклама. Не часта яна ў эфіры, а ўсё ж прыемна, нават калі нас з экрана заклікаюць эканоміць ваду і электраэнергію. Думаю, што ніхто з беларускіх манкуртаў не тэлефануе на тэлестудыю першага канала з пратэстам. Мусіць, пара і ў рэспубліканскіх радыё-праграмах падаваць частку рэкламы на роднай мове, якая пры ўсіх захадах па яе заціску і выжыванні застаецца пакуль дзяржаўнай.

Не так даўно ў "Народнай волі" ў лісце з-за кратаў да дэлегатаў шостага з'езда Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны экс-прэм'ер Міхаіл Чыгір з аптымізмам заявіў, што Беларусь у XXI стагоддзі будзе беларускамоўнай.

Гэтыя прарочыя словы ўсялялі надзею ў сэрца не аднаго шчырага беларуса. Але ж шлях гэты будзе доўгім і пакутлівым, пакуль асфальтавы каток русіфікацыі прасуе Беларусь бязлітасна. Мова наша адкрыта, падчас цынічна, без актыўнага супраціву "нізоў" у правінцыі, выцясняецца адусюль. Трывожныя лічбы падала нядаўна чытачам незалежная газета "Наша слова" ў артыкуле аднаго са сваіх аўтараў, які задаўся мэтай падлічыць колькасць гадзін гучання на першай праграме рэспубліканскага радыё беларускай і расійскай моваў. Яны трывожныя: роднай мове адведзена ўсяго 8,58 гадзін, або 33,02 працэнта часу сутачнага праслухвання, расійскага — 13,3 гадзіны, або 51,9 працэнта часу праслухвання. Амаль удвая больш!

Не лепей глядзіцца гэтая "раскладка" і па другой праграме радыёвяшчання: беларускай мове адведзена 8,21 гадзіны, або 32,2 працэнта ўсяго часу праслухвання, расійскай — 7,5 гадзіны, альбо 29,4 працэнта часу праслухвання. На працягу 10 гадзін і 29 хвілін у эфіры гучала музыка без слоў, альбо песні на іншых мовах — толькі не на беларускай.

Дагэтуль мы, беларусы, не маем свайго "культурнага" тэлеканала, як у Расіі, па якім можна было б паслухаць выступленні нашых слынных паэтаў-празаікаў, вядомых за межамі краіны майстроў сцэны, прагледзець спектакль Дзяржаўнага тэатра імя Янкі Купалы ці Якуба Коласа, выступленні таленавітых фальклорна-этнаграфічных ансамбляў, якіх нямала на Беларусі. Разумею: тут без значных фінансавых выдаткаў не абысціся. Але справа не толькі ў сродках. Пакуль ва ўрадзе за культурай будуць весці нагляд людзі "суслаўскай" школы, цяжка разлічваць на хуткае адкрыццё такога тэлеканала.

Як тут не ўспомніць словы вядомага палымянага змагара за адраджэнне беларускай мовы прафесара Леаніда Лыча: "Прыгледзьцеся, якая хліпенькая ў беларусаў нацыянальная самасвядомасць! Такіх здэбеларусаваных палітыкаў усіх рангаў, такой здэбеларускай інтэлігенцыі, асабліва ў яе самых верхніх зрэзах, у нашай краіне яшчэ ніколі не было..." Дык будзем жа памятаць прарочыя словы Францішка Багушэвіча: "Не забывайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі". Бо тады разам з мовай знікне і сам яе носьбіт — беларускі народ.

Мікола КУТНЯВЕЦКІ,
пенсіянер. г.Слуцк.

Хто ёсць хто

"...А потым я зазірнуў ва Управу БНФ і набыў два бел-чырвона-белыя сцягі на футбол"

Пра свой прыход у палітыку, захапленні і планы рэпарцёру "Народнай волі" Вользе КЛАСКОЎСКАЙ расказвае лідэр "Маладога фронту" Павел СЕВЯРЫНЕЦ.



— Пра твае палітычныя справы добра вядома. А цікава, чым займаецца малады апазіцыянер ў рэдкія хвіліны адпачынку?

— У вольны час пішу, чытаю, мастачу. Большая частка часу ідзе на арганізацыю маладафронтаўскіх мерапрыемстваў, падрыхтоўку дакументаў, культурніцкіх спраў, у тым ліку праграмы "Маладое Адраджэньне", пісанне артыкулаў, складанне "Збораў беларушчыны".

Калі ёсць свабодная хвіліна — чытаю. Зараз больш замежную літаратуру — Умбэрта Эка, Джэймса Джойса, Арцюра Рэмбо, таксама рускую — Набокава, Буніна. Любімыя беларускія творцы — Быкаў, Караткевіч, Гарэцкі, Арлоў.

— Ты скончыў школу з мастацкім ухілам. Чаму не прадоўжыў вучобу ў гэтым кірунку?

— Я малюю, але больш для сябе. У мяне ёсць адмысловая тэхніка — шарыкавая ручка і крэйда. У вольны час малюю з натуры ці па памяці. Дома ляжыць нават калекцыя маіх малюнкаў, штосьці вісіць на сценах. Гэтага і дастаткова. Я лічу, што чалавек, які займаецца, прынамсі, арганізацыйнай працай, павінен размеркаваць свой час так, каб хоць пакрыху паспець у кожным кірунку, — і такім чынам гарманічна развіць усе свае здольнасці.

— Што паўплывала на выбар тваёй прафесіі?

— Геаграфія заўжды была маім хобі. Калі вучыўся ў школе, аблазіў усе ваколіцы Віцебска — шукаў карысныя выкапні. Магчыма, і з гэтым звязана мая любоў да роднай зямлі, бо гэтай зямлі я перабраў, перакапаў і перасыпаў сваімі рукамі багата. Сабраў даволі вялікую калекцыю каменьчыкаў, пераважна тых, якія можна лічыць самацветамі беларускай зямлі. Іх можна апрацоўваць і выкарыстоўваць у ювелірнай справе. Нават зрабіў у БДУ адмысловы даклад, выслуханы з вялікай увагай. І вось зараз з выкладчыкамі працую над працягам гэтай тэмы. Магчыма, штосьці пашэнціць увасобіць у жыццё.

— Якія планы пасля сканчэння універсітэта?

— Збіраюся паступіць у аспірантуру альбо заняцца навуковай дзейнасцю, магчыма, якім-небудзь замежным праектам.

— Як ты прыйшоў у "Малады фронт"?

— Тады гэта была яшчэ маладзёжная фракцыя БНФ. Прыйшоў туды ў кастрычніку 1995 года. Так што, адзначаючы дзесяцігоддзе БНФ, адначасова спраўляў трохгоддзе сваёй палітычнай дзейнасці.

Пачыналася ўсё вельмі цікава. Прыйшоў у фракцыю з прапановай скупляць у кнігарнях танную беларускую літаратуру. І паколькі ініцыятыва заўжды караецца, давялося на сваім гарбе цягаць па некалькі соцень кніжак, прадаваць і нават ладзіць латэрэю. Прынёс фракцыі і значны матэрыяльны прыбытак. Мяне прызначылі сустаршынёй культурнай камісіі. Праз два месяцы я ўжо ўзначальваў яе, а ўвосень 96-га падаў заяву на ўступленне ў Беларускі народны фронт. І быў прыняты ў тую самую ноч, калі правалілася справа з імпічментам — 20 лістапада. А 20 лютага 97-га на справаздачна-выбарчым сходзе маладзёжнай фракцыі мяне амаль што аднагалосна абралі яе старшынёй.

— Твой прыход у Фронт можна лічыць выпадковым?

— Не зусім. Я працаваў у газеце "Знамя юности", калі яна яшчэ, на мой погляд, была больш-менш нармальная, якую рэдагаваў Кацюшэнка. Пісаў невялічкія забаўляльныя матэрыялы, якія часам траплялі нават на першую паласу. А іншым разам і праблемныя — напрыклад, пра студэнцкую рэлігійнасць альбо бізнес мыйшчыкаў машын... Займаючыся гэтым, атрымаў заданне з'ездзіць разам з географамі на Заходнюю Беразіну, каб падрыхтаваць цыкл публікацый. Дарэчы, географы былі людзьмі вальнадумнымі і на сваёй стаянцы ўздымалі бел-чырвона-белы сцяг, у той час — гэта быў 95-ы год — гістарычна-нацыянальны сімвал ужо апынуўся пад забаронай. Публікацыя, дзе я пра гэта згадаў, праскочыла, але сказы пра спяванне "Пагоні" і ўздым нацыянальнага сцяга былі выразаныя.

Тады я вырашыў, што гэта мой апошні выступ у той газеце і, атрымаўшы ганарар, вырашыў пусціць на добрую справу. Пайшоў, адшукаў Управу БНФ і набыў два бел-чырвона-белыя сцягі на футбольны матч.

А прысутны ва Управе Вячаслаў Сіўчык прапанаваў наведваць паседжанні маладзёжнай фракцыі БНФ.

— Як ставяцца да тваёй палітычнай дзейнасці бацькі?

— Нармальна. Амаль што ва ўсім падтрымліваюць.

